**Алесь Багданаў**
*Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў (г. Мінск, Беларусь)*

# НОВЫЯ ФОРМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ЖЫВАПІСУ І МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА Ў МАСТАЦКІХ КАТАЛОГАХ

Агульнавядома, што **каталог** (ад *грэч.* Κατάλογος – спіс) – гэта спіс інфармацыі аб аб’ектах, які складаецца дзеля таго, каб аблегчыць пошук аб’ектаў паводле пэўных прыкмет.

Каталогі твораў выяўленчага мастацтва традыцыйна складаюцца як у галерэях, музеях, так і на аўкцыёнах, выстаўках. Мы звернемся найперш да каталогаў мастацкіх выставак, хаця зробленыя намі высновы могуць быць карысныя і для тых, хто складае каталогі мастацкіх твораў у іншым фармаце.

Менавіта дзякуючы каталогам, якія напачатку былі проста спісамі экспанаваных твораў, гісторыкі мастацтва маюць магчымасць аналізаваць мастацкія працэсы з канца ХІХ ст.

Са з’яўленнем фатаграфіі, асабліва каляровай, каталогі мастацкіх выставак набылі якасна новае значэнне. У 1960–1980-я гады мастак лічыў за гонар, калі ў каталог траплялі рэпрадукцыі ягоных твораў. Сёння каталог калектыўнай мастацкай выстаўкі можа ўключаць усе прапанаваныя ў экспазіцыю творы. Для гэтага яшчэ на этапе адбору (за некалькі месяцаў да адкрыцця выстаўкі) мастакі дасылаюць фатаграфіі сваіх твораў арганізатарам. Такім чынам, каталог можа быць выдадзены яшчэ да вернісажу (такую практыку маюць, напрыклад, арганізатары вельмі папулярнага праекта «Восеньскі салон з “Белгазпрамбанкам”». У эфектна выдадзеных тоўстых каталогах ёсць уступныя артыкулы і не толькі творы, але і кароткія біяграфіі аўтараў.

Якасна новы падыход да стварэння каталога мастацкай Рэспубліканскай маладзёжнай выстаўкі (13.05–25.05.2014) [1] прадэманстраваў малады скульптар і мастацтвазнаўца І. А. Арцімовіч. Ён уключыў у кантэкст візуальнай інфармацыі з выстаўкі (рэпрадукцыі твораў, рэпартажныя фота) яе вербальнае асэнсаванне – эсэ, вершы, якія падрыхтавалі студэнты Інстытута журналістыкі БДУ. Яны самі выбіралі творы, якія найбольш іх кранулі, дзяліліся сваімі ўражаннямі-асацыяцыямі. Такім чынам на старонках каталога адбываецца вобразны дыялог практычна паміж аднагодкамі. Гэта, з аднаго боку, дае для непадрыхтаванага гледача ключ да разумення сучаснага мастацтва, з

другога – застаецца ўнікальным матэрыялам для будучых пакаленняў (інфармацыя пра тое, як успрымаўся той або іншы твор сучаснікамі). Вось, напрыклад, як В. Рычага піша пра карціну А. Скарабагатай «Дзень», якую мы бачым побач:

Саткана з цемры,
Сплецена з поўні,
Цені вейкамі ночы крэсляць
Магутную магію дня
З дзіцячых рук халоднага срэбра
Цягнецца нітка верацяном і стогне:
Раніца будзе пасля [1, с. 94–95].

Дзякуючы вербалізацыі візуальных вобразаў, дыялогу часавага (літаратура) і прасторавага (жывапіс) відаў мастацтва, карціна як бы набывае развіццё ў часе, ажывае.

Выкарыстанне эмацыянальных вобразных каментарыяў ніякім чынам не навязвае гледачу пэўную ацэнку, а толькі пашырае ягонае ўласнае асацыятыўнае поле, дае прастору для ўласнай фантазіі. Падобны падыход актуальны  як для калектыўных выставак, так і для персанальных. Эмацыянальнае вербальнае асэнсаванне экспазіцый студэнтамі Інстытута журналістыкі БДУ ужо некалькі гадоў практыкуе часопіс «Маладосць».

Яшчэ адзін кірунак ноу-хау ў выданні каталогаў мастацкіх выставак – арыгінальныя макеты і выкарыстанне DVD-дыскаў, дзе змяшчаюцца творы (асабліва гэта важна для твораў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, якія паказваюцца ў інтэр’ерах, на аб’ектах, што немагчыма прадэманстраваць  на выстаўцы), а таксама жывыя, запісаныя на відэа, каментарыі мастацтвазнаўцаў [2]. Дарэчы, многія мастакі, фарміруючы калекцыі сваіх твораў у інтэрнэце, уключаюць публікацыі ў друку, інтэрв’ю з газет і часопісаў, што пацвярджае неабходнасць гарманічнага спалучэння візуальнай і вербальнай вобразнай інфармацыі.

Апроч  калектыўных, групавых, персанальных выставак і музейных калекцый на сёння могуць быць складзены каталогі мастацкіх твораў, што аздабляюць інтэр’еры некаторых дзяржаўных будынкаў. Напрыклад, шмат арыгінальных сучасных прац манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і жывапісу ёсць у Палацы Незалежнасці, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, новым будынку Савета Рэспублікі, Міністэрстве замежных спраў, гасцініцы «Мінск». Дзякуючы комплекснаму прафесійнаму падыходу да аздаблення інтэр’ераў, нагадваюць музейныя экспазіцыі і такія спецыяльныя навучальныя ўстановы, як Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Гімназія-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка

і інш. І калі творы жывапісу працуюць найперш на стварэнне атмасферы інтэр'ераў, творы сучаснага манументальна-дэкаратыўнага мастацтва часта вымагаюць дадатковага тлумачэння. Так, на абароне дыпломнай працы выпускніцы БДАМ В. Мельнік у Міністэрстве замежных спраў Беларусі прагучала прапанова змясціць вербальнае тлумачэнне яе вельмі сімвалічнай кампазіцыі «Ружа вятроў», якая размешчана на стале ў адной з залаў. Каталогі твораў, якія знайшлі прапіску ў вышэйназваных установах, могуць быць таксама зроблены з уключэннем твораў і эмацыянальных вербальных каментарыяў да кожнага з іх.

Такім чынам, можна канстатаваць, што каталогі мастацкіх выставак сёння ўяўляюць сабою адметную галіну выдавецкай справы, яны фарміруюць густ сучаснікаў, застаюцца ўнікальным помнікам культуры для нашчадкаў. Найбольш перспектыўнымі ўяўляюцца наступныя формы рэпрэзентацыі твораў мастацтва:

1) абавязковы арыгінальна і прафесійна напісаны ўступ, сістэматызаваная інфармацыя пра аўтараў (аўтара);

2) пры магчымасці суправаджэнне рэпрадукцый твораў эмацыянальнымі вербальнымі каментарыямі (гэта могуць быць эсэ, вершы і г. д.);

3) арыгінальныя макеты каталогаў;

4) выкарыстанне DVD-дыскаў (асабліва актуальна для твораў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва).

5) выданне каталогаў не толькі выставак, але і музейных калекцый, каталогаў твораў, што знаходзяцца ў інтэр'ерах дзяржаўных арганізацый і навучальных установаў.

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Рэспубліканская маладзёжная выстава : Каталог. – Мінск, 2014. – 136 с. (з іл.).
2. Уладзімір Мехавіч. Зафіксаваны час : Каталог. – Мінск, 2002. – 64 с. (з іл. і DVD-дыскам).

**Роман Баканов**
*Казанский (Приволжский) федеральный университет*
*(г. Казань, Россия)*

## ПРОЯВЛЕНИЯ «ЖЕЛТОГО» ТИПА ТЕЛЕКРИТИКИ В ПРАКТИКЕ РОССИЙСКОЙ ЖУРНАЛИСТИКИ

Нами было выявлено, что телевизионная критика в российских газетах 1990-х гг. слабо использовала свои возможности в решении проблемы медийного просвещения населения нашей страны. За многочисленными попытками дать оценку тем или иным телепроектам авто-